


**Л.М.Цімашкова,**
*кандыдат педагагічных навук, дацэнт кафедры педагогікі Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта імя М.Танка*


Педагагічныя кадры

# ФАРМІРАВАННЕ КАМУНІКАТЫЎНАЙ КАМПЕТЭНТНАСЦІ БУДУЧЫХ НАСТАЎНІКАЎ


***Аналіз сучаснай практыкі падрыхтоўкі будучых настаўнікаў у педагагічных універсітэтах сведчыць аб адсутнасці цэласнай сістэмы па фарміраванні камунікатыўных якасцей, неабходных для самарэалізацыі спецыялістаў. Выпускнікі ў пачатку прафесійнай дзейнасці не заўсёды гатовы да творчага выкарыстання сродкаў камунікатыўнага ўздзеяння, нягледзячы на тое што ў айчыннай педагогіцы і псіхалогіі маецца дастатковы вопыт па вывучэнні розных аспектаў педагагічных зносін настаўніка з вучнямі.***


Даследчыкамі дадзенай праблемы вылучаны наступныя напрамкі:

- роля і значэнне камунікатыўнага кампанента ў структуры педагагічнай дзейнасці настаўніка [1—3];
- вывучэнне асаблівасцей педагагічных зносін у залежнасці ад прафесійна значных якасцей настаўніка [4—5];
- вывучэнне заканамернасцей фарміравання ў настаўніка камунікатыўных уменняў і навыкаў [6—8];
- культура педагагічных зносін [9];
- вербальныя і невербальныя сродкі ў кіраванні зносінамі [10—11].

Прафесійная дзейнасць настаўніка разглядаецца ў адпаведнасці з найбольш важным аспектам гуманістычнай канцэпцыі адукацыі — зносінамі, якія накіраваны на развіццё дзіцяці, стварэнне ўмоў для яго самаразвіцця. На першае месца ставяцца духоўна-маральнае ўзаемадзеянне настаўніка і вучня, абмен паміж імі гуманістычнымі каштоўнасцямі. Гэта можа быць рэалізавана ў працэсе інтэнсіўных і эфектыўных зносін, якія выступаюць як мэта, змест і спосаб дзейнасці, таму ўзнікае неабходнасць развіцця ў маладога спецыяліста камунікатыўных здольнасцей, уменняў і навыкаў, што ў сукупнасці і можа быць абазначана паняццем «камунікатыўная кампетэнтнасць». Мы разглядаем яе як цэласны інтэгратыўны феномен, як уласцівасць, што мае высокую прафесійную значнасць. Камунікатыўная кампетэнтнасць настаўніка бачыцца як цэласна-асобаснае ўтварэнне, якое ўключае ў сябе гуманістычныя арыентацыі, камунікатыўныя каштоўнасці, сукупнасць якасцей, якія забяспечваюць


***Лілія Мікалаеўна Цімашкова*** *закончыла філалагічны факультэт педагагічнага інстытута ў Растове-на-Доне, аспірантуру БДПУ імя М.Танка. Аўтар каля 30 публікацый у навуковых зборніках, часопісе «Весці БДПУ» і інш., вучэбна-метадычнага дапаможніка (разам з А.А.Грымацем) «Фарміраванне камунікатыўных уменняў будучых настаўнікаў».*

веданне асноў зносін, гатоўнасць да дыялога з вучнем, культуру ўзаемадзеяння, якая праяўляецца ў працэсе педагагічных зносін.

Галоўнае месца ў структуры камунікатыўнай кампетэнтнасці займаюць гуманістычныя арыентацыі і камунікатыўныя каштоўнасці, якія не толькі вызначаюць наяўнасць тых або іншых матываў, але і значна ўплываюць на дзеянні настаўніка падчас работы з дзецьмі, а таксама стымулююць узнікненне ў яго патрэбнасці ў набыцці прафесійна значных камунікатыўных ведаў. Таму гуманістычныя арыентацыі, камунікатыўныя каштоўнасці, асобасны сэнс прафесіі маюць прынцыповае значэнне для фарміравання індывідуальнага стылю педагагічнай дзейнасці, вызначаюць яго гуманны, дэмакратычны ці аўтарытарны характар.

У 2001 г. у БДПУ імя М.Танка намі праводзілася эмпірычнае даследаванне ўзроўняў камунікатыўнай кампетэнтнасці студэнтаў. Мэтай яго стала выяўленне і тэарэтычнае абгрунтаванне педагагічных умоў, неабходных для развіцця камунікатыўнай кампетэнтнасці будучага настаўніка як інтэгратыўнай шматузроўневай якасці асобы. Былі вылучаны крытэрыі, якія вызначаюць і асноўныя структурныя кампаненты дадзенага феномена: каштоўнасна-асобасны, кагнітыўны, тэхналагічны.

*Каштоўнасна-асобасны крытэрый* дае магчымасць апісаць агульныя камунікатыўныя каштоўнасці (значнасць вучня для настаўніка, важнасць працэсу іх зносін, каштоўнасць культурных формаў камунікацыі); вызначыць накіраванасць і матывацыю камунікатыўных дзеянняў настаўніка, а таксама сукупнасць асобасных якасцей.

*Кагнітыўны крытэрый* дазваляе выявіць узровень камунікатыўных ведаў настаўніка, уменне аперыраваць імі, яго здольнасць ператвараць педагагічныя задачы ў камунікатыўныя (пазнавальныя) шляхам пабудовы праграм у планах прафесійных зносін, мадэляваць камунікатыўныя паводзіны. Гэты крытэрый дае магчымасць апісання ўнутрыасобасных асаблівасцей, г. зн. здольнасці да самавывучэння, самаўдасканалення, рэалізацыі каштоўнасных установак і асаблівасцей паводзін удзельнікаў педагагічнага працэсу ў складаных умовах і сітуацыях выхавання і навучання.

*Тэхналагічны крытэрый* дазваляе вызначыць наяўнасць неабходных для эфектыўных зносін вучняў і настаўніка камунікатыўных навыкаў і уменняў, ступень іх сфарміраванасці.

Кожны з крытэрыяў выяўляецца пры дапамозе сістэмы эмпірычных паказчыкаў, якія адлюстроўваюць ступень сфарміраванасці асобаснага (узроўневага) кампанента камунікатыўнай кампетэнтнасці асобы. Першы з вышэйназваных адлюстроўвае асноўныя камунікатыўныя ўстаноўкі і арыентацыі, якасці асобы. Для яго характэрныя наступныя паказчыкі:

а) эмпатыя — здольнасць эмацыянальна адгукнуцца на праблемы вучня, схільнасць бачыць свет вачыма іншых людзей, адчуваць і разумець тое, што адбываецца, так, як яны; гатоўнасць успрымаць учынкі іншых з іх пункту гледжання;

б) педагагічная камунікабельнасць — патрэбнасць у зносінах з дзецьмі, пазітыўная ўстаноўка на іншага чалавека, гатоўнасць прымаць вучня такім, які ён ёсць, схільнасць акцэнтаваць увагу сваю і школьнікаў на добрых якасцях;

в) эмацыянальная прывабнасць як сродак прыхільнасці да сябе вучняў, што абумоўлена прафесійнай эрудыцыяй, творчай своеасаблівасцю, высокай агульнай і маральна-эстэтычнай культурай;

г) эмацыянальная ўстойлівасць — здольнасць кантраляваць уласныя эмацыянальныя рэакцыі на тое, што адбываецца на ўроку і ў паўсядзённым жыцці, і адлюстроўваць дынаміку міжасобасных адносін.

Кагнітыўны крытэрый, які адлюстроўвае сацыяльна-перцэптыўны аспект камунікатыўнай кампетэнтнасці будучага настаўніка, характарызуецца наступнымі паказчыкамі:

а) камунікатыўнае канструяванне — здольнасць вызначаць камунікатыўны (пазнавальны) кампанент праблемнай педагагічнай сітуацыі, фармуляваць і рашаць камунікатыўную задачу, ставіць мэту, выбіраць сродкі, улічваць альтэрнатывы і ацэньваць іх педагагічны эфект;

б) рэфлексія — здольнасць разумець свой стан у працэсе зносін і ўзаемадзеяння з партнёрамі, а таксама ўспрымаць сябе і свае дзеянні іх вачыма.

Тэхналагічны крытэрый адлюстроўвае паводзінскі аспект камунікатыўнай кампе-

тэнтнасці і ўменняў, неабходных будучаму настаўніку. Сярод іх вылучаны наступныя:

а) гібкасць у зносінах — здольнасць устанаўліваць і падтрымліваць камунікатыўныя кантакты з кожным вучнем, улічваць яго індывідуальнасць і своеасаблівасць, ажыццяўляць пошук розных спосабаў арганізацыі міжасобасных зносін, вар'іраваць іх глыбіню;

б) здольнасць да супрацоўніцтва як інтэгратыўная якасць, якая змяшчае ў сабе ўменні фармуляваць уласны пункт гледжання, прыслухоўвацца да іншага; адстойваць сваё меркаванне пры дапамозе лагічнай аргументацыі, аказваць іншаму эмацыянальную і змястоўную падтрымку, кантраляваць працэс зносін, займаць дыялагічную, а не маналагічную пазіцыю, арганічна спалучаць «ролевыя» і «міжасобасныя» станы, дзелавыя і чалавечыя зносіны;

в) уменне аказваць псіхалагічны ўплыў на вучня, адэкватны педагагічнай задачы.

Пры дыягностыцы ступеней выяўленасці апісаных намі паказчыкаў камунікатыўнай кампетэнтнасці праводзілася доследна-эксперыментальная работа на факультэце беларускай філалогіі і факультэце народнай культуры з студэнтамі I і III—V курсаў. Пры гэтым выкарыстоўваліся тэсціраванне, самаацэнка студэнтамі сваіх камунікатыўных асаблівасцей (у працэсе выканання заданняў, трэнінгавых практыкаванняў, удзелу ў ролевых гульнях, аналізу праблемных сітуацый, групавых дыскусій, мікравыкладання) і экспертнай ацэнкі (у ролі экспертаў выступалі выкладчыкі-метадысты, псіхолагі-педагогі і школьныя настаўнікі).

Праводзілася ацэнка студэнтамі і экспертамі ўзроўню камунікатыўнай кампетэнтнасці студэнтаў па шкале, якая мела пяць значэнняў (нізкае, ніжэй сярэдняга, сярэдняе, вышэй сярэдняга, высокае). Яна дала наступныя вынікі: каштоўнасна-асобасны ўзровень — «ніжэй сярэдняга», кагнітыўны — «сярэдні», тэхналагічны — «ніжэй сярэдняга».

Гуманізацыя і дэмакратызацыя сістэмы адукацыі, на нашу думку, павінны забяспечыць адпаведны ўзровень педагагічнай накіраванасці асобы настаўніка. Аднак даследаванне паказала, што ўзнікае неабходнасць перагляду зместу педагагічных дысцыплін з мэтай іх арыентацыі на фарміраванне вобраза гуманістычных зносін у будучага настаўніка. Для гэтага неабходна і арганізацыя спецыяльнага навучання, што дасць магчымасць студэнтам павысіць узровень камунікатыўнай кампетэнтнасці. Сама прырода апошняй і заканамернасці прафесійнага станаўлення маладога спецыяліста дазволілі сфармуляваць асноўныя педагагічныя ўмовы фарміравання дадзенай інтэгратыўнай якасці. Гэта сістэматызацыя камунікатыўнага кампанента ў змесце дысцыплін педагагічнага цыкла; рэалізацыя рэфлексіўна-дзейнаснага падыходу ў працэсе вывучэння педагагічных дысцыплін; стабільнасць каштоўнасна-асобасных адносін выкладчыкаў і студэнтаў, якія садзейнічаюць фарміраванню ў будучага настаўніка вобраза гуманістычных зносін.

Для сістэматызацыі камунікатыўнага кампанента ў змесце дысцыплін педагагічнага цыкла былі прааналізаваны рабочыя праграмы выкладчыкаў агульнауніверсітэцкай кафедры педагогікі (К.У.Гаўрылавец, Л.В.Пенкрат, В.А.Кішкурна і інш.) па педагагічных дысцыплінах на прадмет структураванасці камунікатыўнай складаючай. Выяўлены наступныя недахопы:

- не разгортваюцца шматлікія функцыі зносін у развіцці асобы вучняў;
- не ўдзяляецца неабходнай увагі гуманістычнай накіраванасці асобы настаўніка як перадумове развіцця яго камунікатыўнай кампетэнтнасці;
- адсутнічаюць персаніфікаваныя прыклады педагагічных зносін пры вывучэнні курса гісторыі педагогікі;
- не разглядаюцца пытанні асобасна арыентаванай адукацыі, спосабаў гуманізацыі педагагічных зносін;
- не прадугледжваецца рэфлексія студэнтамі ўласнага стылю зносін.

Была распрацавана структура камунікатыўнага зместу педагагічных дысцыплін. У яе ўключаны: гуманістычная прырода педагагічнай дзейнасці; маналагічныя і дыялагічныя зносіны; камунікатыўная перцэпцыя, педагагічная абарона дзіцяці, камунікатыўнае табу; камунікатыўнае забеспячэнне ўрока, дзелавы і асобасны ўзроўні зносін, педагагічныя канфлікты.

Змест адукацыі прадугледжвае не толькі ідэі, але і спосабы іх засваення, таму была вызначана метадычная сістэма, якая забяспечвала б глыбокае засваенне і прынятце гуманістычнай ідэалогіі.

У працэсе выкарыстання актыўных метадаў навучання зносінам (аналізу праблемных сітуацый, групавых дыскусій, ролевых і дзелавых гульняў, педагагічных студый і педагагічных майстэрань, трэнінгавых практыкаванняў, мікравыкладання, відэатрэнінгаў і г.д.) студэнты былі накіраваны на асобасна арыентаваныя зносіны (роўнапартнёрскі стыль узаемадзеяння, пазітыўныя адносіны да вучняў, эмпатыйнае разуменне іншага чалавека і інш.).

Рэфлексіўна-дзейнасны падыход пры вывучэнні педагагічных дысцыплін з'яўляецца канкрэтызацыяй фундаментальнага прынцыпу ўзаемасувязі тэорыі і практыкі ў прафесійнай падрыхтоўцы спецыяліста. У рэфлексіўна-дзейнасным навучанні педагагічная дзейнасць не толькі вывучаецца, але і практычна пераўтвараецца. Студэнты вучацца мадэляваць сітуацыі зносін, прадугледжваць магчымыя пазіцыі вучняў і мысленна прагназаваць сваё стаўленне да сітуацыі, бачыць сябе вачыма школьнікаў, аналізаваць дзеянні ўласныя і сваіх вучняў. Усё гэта фарміруе ўстаноўку на пастаянную зваротную сувязь з групай.

Рэфлексіўны самааналіз студэнтамі камунікатыўных уменняў садзейнічае ўсведамленню сваёй пазіцыі ў працэсе зносін і выбару прадуктыўных тактык паводзін. Калектыўная рэфлексія ўяўляе спрыяльны комплекс умоў для перанясення сукупнасці ведаў, вопыту і пачуццяў у прафесійныя перакананні, надзяляе здольнасцю стаць асновай фарміравання прафесійна значных установак, сугучных ідэям гуманізму, асобаснай свабоды, выхавання як развіцця ў студэнтаў механізмаў свабоднага свядомага самарэгулявання. Інтэнсіўнае эмацыянальнае перажыванне калектыўнай рэфлексіі стварае унікальныя ўнутраныя ўмовы для самааналізу і набыцця перакананя ў важнасці ўласнага развіцця.

Аналіз сутнасці камунікатыўнай кампетэнтнасці дазволіў вылучыць яшчэ адну ўмову для фарміравання дадзенай якасці — стабільнасць каштоўнасна-асобасных адносін выкладчыкаў і студэнтаў. Суб'ект-суб'ектнае дыялогавае ўзаемадзеянне аказвае ўплыў на развіццё камунікатыўнай кампетэнтнасці будучага настаўніка толькі тады, калі сам выкладчык валодае высокім узроўнем шэрага камунікатыўных каштоўнасцей, якасцей і ўменняў.

Усведамленне выкладчыкам важнасці працэсу зносін, гуманнага ўзаемадзеяння са студэнтамі рэалізуецца на практыцы ў своеасаблівых эмпатыйных зносінах, якія прадугледжваюць наяўнасць у педагога камунікатыўных уменняў: пераканаць кожнага студэнта ў яго схаваных здольнасцях і гэтым садзейнічаць яго самаразвіццю, разуменню іншых і суперажыванню людзям; стварыць на занятках атмасферу супрацоўніцтва, сумеснай творчасці, мыслення праз сістэму зваротаў, далучэння ўдзельнікаў да педагагічнага працэсу; наладжваць дзелавы эмацыянальны кантакт; ставіць сябе на месца студэнта; разумець логіку яго меркаванняў, бачыць сітуацыю яго вачыма, узмацняць у студэнтаў пачуццё самапавагі і пераконваць іх у сваёй чалавечай каштоўнасці і унікальнасці.

Камфортныя, эмацыянальныя зносіны на занятках ствараюць умовы для творчай дзейнасці, добразычлівых паводзін, якія дапамагаюць удзельнікам у праяўленні асаблівай гуманнай устаноўкі на іншага чалавека. Камфортныя зносіны прадугледжваюць, што ў выніку іх павінны ўзнікнуць станоўчыя эмоцыі і ў выкладчыка, і ў студэнта.

Гуманістычныя зносіны прадугледжваюць ліквідацыю шэрага бар'ераў (фізічнага, тэрміналагічнага, сацыяльнага, эстэтычнага, матывацыйнага), якія могуць узнікнуць у выкладчыка пры непасрэдным узаемадзеянні са студэнтамі [10, с. 153—154]. Асаблівае значэнне набывае прадухіленне матывацыйнага бар'ера, які ўзнікае пры адсутнасці цікавасці да партнёра па зносінах, калі выкладчык і студэнт выкарыстоўваюць адзін аднаго як сродак самавыяўлення. Іх каштоўнасна-асобасныя ўзаемаадносіны ўяўляюць унікальнае поле для самаўдасканалення будучых настаўнікаў. Усталяванне гуманных узаемаадносін патрабуе ад студэнтаў і выкладчыкаў усведамлення неацэннай важнасці фасілітыруючай (якая дае стымул да дзеяння і адначасова вызваляе ад трывожнасці) педагагічнай дзейнасці.

У працэсе рэалізацыі сукупнасці вызначаных умоў развіцця камунікатыўнай кампетэнтнасці будучых настаўнікаў павысіўся яе ўзровень; назіралася патрэбнасць у зносінах з дзецьмі; павялічыўся ўзровень здольнасці да эмпатыі, дамінуючым стала каштоўнаснае стаўленне да ўзаемных кан-

тактаў як спосабу прафесійнай дзейнасці; адпрыйшло ўсведамленне значнасці камунікатыўных каштоўнасцей, якія выступаюць асновай гуманных, фасілітыраваных зносін педагога з дзецьмі: каштоўнасць іх адкрытасці, эмпатыйнасці, этычных формаў; адбылося асэнсаванне будучымі настаўнікамі неабходнасці гуманізацыі вучэбна-выхаваўчага працэсу, камунікатыўнага самаразвіцця і асобаснага росту.

1. *Кан-Калик В.А.* Учителю о педагогическом общении: Кн. для учителя. — М.: Просвещение, 1987. — 190 с.
2. *Кузьмина Н.В.* Очерки психологии труда учителя. — Л.: Изд-во Ленингр. ун-та, 1967. — 183 с.
3. *Леонтьев А.А.* Педагогическое общение. — М.: Знание, 1979. — 47 с.
4. *Кухарев Н.В.* На пути к профессиональному совершенству. — М.: Просвещение, 1990. — 159 с.
5. *Страхов И.В.* Лекция как метод преподавания психологии в педагогических институтах. — Саратов: Изд-во Сарат. ун-та, 1980. — 27 с.
6. *Добрович А.Б.* Воспитателю о психологии и психогигиене общения. — М.: Просвещение, 1987. — 205 с.
7. *Добрович А.Б.* Общение: наука и искусство. — М.: Знание, 1980.— 159 с.
8. *Грымаць А.А., Цімашкова Л.М.* Фарміраванне камунікатыўных уменняў будучых настаўнікаў. — Мн.: Бел. дзярж. пед. ун-т, 2000. — 183 с.
9. *Грехнёв В.С.* Культура педагогического общения: Кн. для учителя. — М.: Просвещение, 1980. — 144 с.
10. *Мищенко В.А.* Формирование коммуникативно-технологической культуры учителя: Дис. ... канд. пед. наук: 13.00.01 / Моск. пед. ун-т. — М., 1999. — С. 153—154.
11. *Рыданова И.И.* Основы педагогики общения. — Мн.: Бел. навука, 1998. — 319 с.
12. *Лабунская В.А.* Невербальное поведение (социально-перцептивный подход). — Ростов-на-Дону: Изд-во Ростовского ун-та, 1985. — 134 с.
13. *Тимошкова Л.Н.* Формирование коммуникативной компетентности студентов педвуза (на материале изучения педагогических дисциплин: Дис. ... канд. пед. наук: 13.00.08) / БГПУ им. М.Танка. — Мн., 2001. — 154 с.

## Цікава даведацца

### НАСА ЗАЙМЕТСЯ ПОИСКОМ ПЛАНЕТ, ПРИГОДНЫХ К ЖИЗНИ

Национальное космическое агентство (НАСА) США объявило о завершении конкурса на разработку проекта будущих орбитальных телескопов, задачей которых будет поиск планет, пригодных к жизни и близких по характеристикам к Земле, сообщает CNN.

Конкурсная комиссия в течение 2 с половиной лет рассматривала более 60 конкурсных проектов и отобрала лишь два из них. Их посчитали «наиболее реальными для дальнейшего изучения и доработки».

Один из проектов, который называется «Искатель землеобразных планет» (Terrestrial Planet Finder — TPF), предполагает объединить количество маленьких инфракрасных интерферометров, расположив их таким образом, что они образуют одну большую обсерваторию.

CNN описывает принцип его действия как «расческу», зубья которой будут «отсеивать» свет звезд, пропуская слабое излучение более мелких объектов.

Другой финалист — «Коронограф видимого света» (Visible Light Coronagraph) — будет обычным оптическим телескопом, зеркало которого больше зеркала знаменитого телескопа Hubble. Кроме того, его оборудуют специальной оптикой для блокирования звездного света.

Ожидается, что по крайней мере один из этих проектов будет реализован в течение ближайших десяти лет.

*www.lenta.ru*